***Наталля Петухова***

# ЭСТЭТЫЧНЫ АНАЛІЗ НАРОДНАЙ ПЕСНІ Ў ДЗЕЙНАСЦІ ДЗІЦЯЧАГА ФАЛЬКЛОРНАГА КАЛЕКТЫВУ

У дзейнасці дзіцячых фальклорных калектываў вялікае месца адводзіцца развучванню і выкананню народных песень. Выкарыстанне народных спеваў і непарыўна знітаваных з імі ў побыце гульняў, рухаў, побытавых танцаў – эфектыўны шлях далучэння дзяцей і падлеткаў да традыцыйнай беларускай культуры і пашырэння іх эстэтычнага вопыту. Пры гэтым, для дэманстрацыі фальклорных твораў на рэпетыцыйных занятках даследчыкі І.М. Грамовіч [1; 2], В.В. Калацэй [3], М.А. Козенка [4], Т.А. Пладунова [5], Л.Л. Ражкова [6], Л.В. Снапкова [2] і інш. раяць выкарыстоўваць пераважна этнаграфічныя запісы. Аднак, падчас эксперыментальнай работы мы сутыкнуліся з праблемай, добра знаёмай кіраўнікам дзіцячых фальклорных калектываў: неразуменнем дзецьмі і падлеткамі этнаграфічнага выканання народных песень.

На жаль, многія сучасныя дзеці ніколі не чулі народных песень, асабліва ў этнаграфічным выкананні, таму ў іх даволі абмежаваныя слыхавыя ўяўленні. Як правіла, іх цікавіць папулярная музыка, што негатыўна адбіваецца на ўспрыманні народных песень: яны не ўспрымаюць фальклорны твор свядома, не разумеюць яго мову, не могуць выказаць да яго свае адносіны. Гэта галоўная прычына павярхоўнага засваення зместу фальклорнай адзінкі. Як вынік – падчас выканання народных песень удзельнікі калектываў дэзарыентуюцца, што адмоўна ўплывае на іх эстэтычнае развіццё. Каб гэтага не адбывалася, намі быў выкарыстаны метад эстэтычнага аналізу народных песень, які дапамагаў дзецям зразумець характар фальклорных твораў і глыбока засвоіць іх змест.

Звычайна эстэтычны аналіз народных песень уключае тры этапы: эмацыянальны, аналітычны і творчы. Эмацыянальны этап – гэта пачуццёвае знаёмства з песняй. Для актывізацыі ўвагі дзяцей перад праслухоўваннем неабходна паставіць праблемнае пытанне, змест якога можа вар'іравацца, напрыклад: «Калі ласка, паспрабуйце вызначыць, калі – зімой, вясной, летам ці восенню – выконвалася гэта песня?», «У час якога свята, на вашу думку, можа гучаць гэта песня?», «Якія паэтычныя вобразы прысутнічаюць у гэтай песні?». Такія пытанні стымулююць пазнаваўчы інтарэс і актывізуюць увагу ўдзельнікаў калектыву, настройваюць на ўспрыманне твора. Выразнае, каларытнае выкананне песні заўсёды выклікае ў дзяцей эмацыянальны водгук, які, у сваю чаргу, дапамагае спасціжэнню адмысловай эстэтыкі, духоўнасці і гармоніі, закладзенай у змесце народнай песні.

Першапачатковае эстэтычнае ўражанне – падстава для аналізу твора на другім этапе – аналітычным, калі эстэтычныя эмоцыі становяцца аб'ектам роздуму, ацэнкі. Асаблівае значэнне варта надаваць аналізу мастацкіх асаблівасцей народнай песні, яе жанравай спецыфікі. Вывучэнне розных праяў традыцыйнай беларускай культуры, святаў беларускага календара, міфалогіі, знаёмства з побытам старажытных беларусаў набліжаюць дзяцей і падлеткаў да ўсведамлення паэтычных фарбаў фальклору, што значна пашырае дыяпазон эстэтычнага ўспрымання народнай песні, спрыяе засваенню яе сэнсавага і сімвалічнага падтэксту. Напрыклад, падчас знаёмства з купальскай песняй «Шла купалка па вуліцы» (вёска Ананчыцы Салігорскага раёна Мінскай вобласці) мэтазгодна разабраць наступныя пытанні: «Што гэта за свята – Купалле?», «Навошта ў купальскую ноч трэба «пільнаваць» жыта?», «Якія купальскія легенды і паданні вы ведаеце?» і інш. Адказваючы на пытанні такога тыпу, удзельнікі калектываў спасцігаюць эстэтычную сутнасць паэтычных тэкстаў народных песень і пачынаюць глыбока адчуваць эмацыянальны настрой фальклору, рацыянальна ўсведамляць яго. Гэта, у сваю чаргу, пашырае моўную рэпрэзентацыю эмоцый, якія выражаюцца праз розныя тэрміны, што выкарыстоўваюцца для апісання ўспрынятых сюжэтаў, паэтычных вобразаў, а таксама выказвання ўласных эмоцый і пачуццяў.

На творчым этапе дзякуючы глыбокаму асэнсаванню эстэтычнай сутнасці фальклорнага твора ў выхаванцаў з'яўляюцца ўласныя эстэтычныя меркаванні, у якіх выяўляюцца не толькі эмоцыі, атрыманыя падчас знаёмства з ім, але і глыбокія каштоўнасныя адносіны да фальклору. Эстэтычныя меркаванні дзяцей і падлеткаў сведчаць аб ступені развіцця іх пачуццяў, здольнасці аднаўляць цэласны мастацкі вобраз народнай песні на падставе ўласных асацыяцый праз параўнанне са з'явамі рэчаіснасці, іншымі творамі фальклору або сумежных мастацтваў, што садзейнічае паступоваму павышэнню і ўзбагачэнню ўзроўню ўспрымання не толькі фальклорных твораў, але і адлюстраваных у іх у вобразнай, мастацкай форме аб'ектаў рэчаіснасці. Рацыянальнае ўсведамленне, спасціжэнне твораў фальклору дапамагае ўдзельнікам узнавіць у сваім уяўленні адэкватныя эстэтычныя вобразы, глыбока ўсвядоміць і засвоіць іх эстэтычны змест, што спрыяе назапашванню мноства эстэтычных уражанняў і ведаў, пашырэнню эстэтычнага вопыту, на падставе якога яны вучацца з агульнай масы прыродных і жыццёвых з'яў вылучаць уласна эстэтычныя і дакладана выказвацца аб іх каштоўнасці і прыгажосці.

Такім чынам, на наш погляд метад эстэтычнага аналізу народнай песні актывізуе эстэтычную думку ўдзельнікаў фальклорных калектываў, садзейнічае засваенню імі шматпланавага і асацыятыўнага зместу паэтычных і музычных формул, якія адлюстроўваюць эмацыянальна-вобразны змест беларускай народнай песні, дапамагае адчуць цэласнасць, глыбіню і гармонію спачатку мастацкіх твораў фальклору, а потым і акаляючага асяроддзя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры:**


1. Грамовіч, І.М. Педагагічныя аспекты навучання народнай манеры спеваў з улікам рэгіянальных песенных традыцый Беларусі : аўтарэф. дыс. … канд. пед. навук : 13.00.05 / І.М. Грамовіч ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 1998. – 20 с.
2. Грамовіч, І.М. Методыка работы з фальклорным гуртам / І.М. Грамовіч, Л.В. Снапкова. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 139 с.
3. Калацэй, В.В. Да пытання гісторыі этнакультурнага выхавання ў постфальклорных асяродках Беларусі (мяжа XX–XXI стагоддзяў) / В.В. Калацэй // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання : зб. навук. прац удзельнікаў II Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 29–30 крас. 2010 г.). – Мінск : БДУКМ, 2010. – С. 151–152.
4. Козенка, М.А. Праблемы захавання і развіцця мастацкіх традыцый Гомельскай вобласці / М.А. Козенка // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва : навук.-інфарм. зб. / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 1993. – Вып 3. – С. 22–32.
5. Пладунова, Т.А. Рухомы фэст «Па святах «Сонечнага крыжа»: сацыяльны запыт і канцэпцыя / Т.А. Пладунова // Штудыі рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы. – Мінск : БДУКМ, 2007. – С. 22–26.
6. Ражкова, Л.Л. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах : дыс. … канд. пед. навук : 13.00.05 / Л.Л. Ражкова ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2007. – 145 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ